*1.Baker's* Biographical Dictionary of Musicians / Ed. by Nicolas Slonimsky: In 6 v. – N.Y.: Schirmer Books, 2001.

*2.Campbell R.* Mandolin // The New Grove Dictionary of Music and Musicians / Ed. by S.Sadie: In 20 v. – London: Macmillan Publishers Limited, 1994. – V. 11. – P. 606–611.

*3.Renhard Kurt.* Mandola und Mandoline // Die Musik in Geschichte und Gegenwart: Allgemene Enzyklopädie der Musik begründet von Friedrich Biume / Herausgeb. von L.Finscher. – Kassel: S. 5. – P.966–967.

*4.Tyler J., Sparks P.* Mandolin // The New Grove Dictionary of Music and Musicians. – Second edition / Ed. by S.Sadie: In 21 v. – Oxford, England: Macmillan Publishers Limited, 2001. – V. 15. – P. 737–743.

*А.С.Белавусава*

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ ГАНЧАРСТВА І ТКАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX ст.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у сувязі са зменай грамадска-палітычных і эканамічных умоў адбыліся змены і ў культурным жыцці Беларусі. Даволі складаныя эканамічныя абставіны паўплывалі на стан і развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Рамесніцкая вытворчасць паступова абмяжоўвалася фабрычнай. Майстры пачыналі пошук новых, выразных сродкаў, якія б адпавядалі зменлівым густам пакупнікоў. Народнае мастацтва ў гэты час адчувала пэўныя цяжкасці, выкліканыя канкурэнцыяй з фабрычнай прамысловасцю. Некаторыя рамёствы знікалі, іншыя працягвалі развівацца. У ліку апошніх можна назваць ганчарства і ткацтва, якія былі распаўсюджаны даволі шырока.

Асноўнае ў развіцці ганчарства і ткацтва ў пачатку XX в. – гэта новыя формы і ўзбагачэнне дэкору на аснове традыцый, якія складаліся стагоддзямі. Так, у ганчарнай справе ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу майстры імкнуліся ўзбагаціць дэкор сваіх вырабаў, пашырыць асартымент.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З’явіліся разнастайныя вазы, падсвечнікі, дробная настольная пластыка. Напрыклад, у заходняй частцы Беларусі ( Пружаны, Мір, Поразава і інш.) выраблялі пераважна чорнаглянцавы посуд, які адрозніваўся геаметрычным арнаментам у выглядзе елачак, сетачак, палосак; у Цэнтральным і Усходнім рэгіёнах Беларусі абмяжоўваліся матавым, гліняным фонам практычна без дэкору; керамічныя вырабы Падняпроўя характарызаваліся вытанчанасцю формаў пры сціплым дэкоры, уяўляючы сабой простыя, хвалістыя пояскі; на поўначы Беларусі (Глыбокае, Дзісна і інш.) пераважалі масіўныя, устой-лівыя і ёмістыя вырабы.

Беларускае ткацтва ў гэты час, нягледзячы на ўплыў і канкурэнцыю з фабрычнай вытворчасцю, таксама развівала свае традыцыі. У дэкоры тканых вырабаў з’яўляюцца новыя матывы, звязаныя з рэвалюцыяй. У той жа час мяняецца і каларыстычная гама. Папулярнасцю ў керамістаў пачынае карыстацца рознакаляровая паліва, якая зрабіла вырабы больш дэкаратыўнымі. Паліваю аздабляўся ў асноўным верх вырабаў, дзякуючы чаму атрымліваўся своеасаблівы кантраст бліскучай палівы і матавай фактуры гліны. Каляровая гама тканін узбагачаецца дзякуючы з’яўленню ў ёй нітак новых адценняў – фіялетавых, жоўтых, ружовых і інш. Часта ў якасці ўзораў мастакамі ганчарнай справы выкарыстоўваліся вытанчаныя формы фарфоравага посуду, але яны перапрацоўваліся. Увогуле вырабы мелі традыцыйныя, нацыянальныя формы, простыя і выразныя, у аснове якіх ляжалі шар, конус і цыліндр. Напрыклад, пружанская і гараднянская кераміка (паўднёва-заходняя Беларусь) адрознівалася шарападобнасцю і прысадзістасцю, а таксама (у большасці выпадкаў) вялікімі памерамі.

У ткацтве нязменнымі застаюцца браная, закладная, шматнітовая тэхнікі. На Бабруйшчыне быў распаўсюджаны даволі складаны від бранай тэхнікі – ператыканне, узоры якога амаль не адрозніваліся ад тканага палатна шпалер.

У 30-я гг. у многіх гарадах і мястэчках з’яўляюцца керамічныя майстэрні (Барысаў, Гарадок, Урэчча, Бабінавічы і інш.), паколькі керамічныя вырабы карыстаюцца ў насельніцтва вялікім попытам. Адбываюцца змены і ў асартыменце, які складаўся ў большасці выпадкаў з прадметаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходных у першую чаргу ў гаспадарцы. Але майстры працягвалі ствараць і дэкаратыўныя рэчы – мудрагелістыя вазы, насценныя талеркі і іншыя вырабы.

Ткацтва ў гэты час развівае свае традыцыі, паколькі з'яўляецца практычна хатнім рамяством. Многіх таленавітых ткачых запрашалі працаваць у ткацкія майстэрні, якія ў той час адкрываліся у некаторых гарадах (Віцебск, Магілёў, Слуцк і інш.)

У 30-я гг. у ткацтве і ганчарстве ўзрастае дэкаратыўная функцыя. Буйныя ганчарныя цэнтры, такія як Мір, Пружаны, Глыбокае, займаліся пошукам і распрацоўкай новых формаў, пашырэннем разнастайнага дэкору. Разам з традыцыйнымі матывамі дэкору шырокае распаўсюджанне атрымалі матывы савецкай арнаментыкі – серп, молат, пяціканцовая зорка (асабліва ў ткацтве). З'яўляюцца тканыя партрэты Леніна і іншых палітычных дзеячаў.

Каларыстычная гама вырабаў узбагачаецца дзякуючы актыўнаму выкарыстанню ганчарамі рознакаляровай палівы і ткачыхамі нітак новых адценняў. Гэтая рыса характэрная для тканін і ручнікоў Заходняга Палесся (у прадуманай гармоніі палос чырвонага і белага). У вырабах вёскі Моталь ускладняецца колеравая гама, раслінны арнамент становіцца больш разнастайным. В.А.Лабачэўская ў сваёй кнізе "Повязь часоў – беларускі ручнік" (Мн., 2002) гаворыць аб узбагачэнні знакамітага мотальскага ручніка "мастацкай стыхіяй сялянскай культуры", які, нягледзячы на гэта, усё ж не згубіў мясцовай выразнасці. Ткачыхі ў гэтым мястэчку актыўна ўводзілі ў тканіну ніткі зялёнага, ружовага, сіняга, фіялетавага, жоўтага і іншых колераў. Класічная традыцыйная кампазіцыя ручнікоў г. Іванава ўзбагачаецца палосамі – бардзюрамі ў выглядзе шашачнага арнаменту і тонкімі палоскамі ружовага, блакітнага або зялёнага колераў.

Тая ж тэндэнцыя назіраецца і ў Драгічынскім раёне, дзе майстрыхі выкарыстоўвалі фабрычныя каляровыя ніткі мулінэ для вышывання. У той жа кнізе В.А.Лабачэўская ўказвае на асаблівасць у ткацтве гэтага рэгіёну, якая заключалася ў гарманічным спалучэнні сучаснай яркай вышыўкі і тканага льнянога палатна, у той час як у іншых рэгіёнах вышывалі па фабрычных дарагіх тканінах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На Усходнім Палессі, дзе тканіны ўяўляюць спалучэнне дзвюх этнакультурных традыцый – заходнепалескую чырвона-белую паласатасць і падняпроўскую геаметрычна-знакавую арнаментальнасць, якая складалася ў асноўным з разнастайных ромбаў, у 20–30-я гг. таксама назіраецца захапленне дэкаратыўнасцю і паліхроміяй.

Ткацтва Падняпроўя і Паазер'я характарызуе тая ж тэндэнцыя шматколернасці і разнастайнасці дэкаратыўных матываў. Агульную стылістыку буда-кашалёўскіх тканін і ручнікоў складаюць разнастайныя ромбы з розным запаўненнем унутры, ромбы з кручкамі і інш.

У 30-я гг. у сфарміраваны чырвона-белы варыянт неглюбскага ручніка далучаецца чорны колер.

Асіповіцкае, чэрвеньскае, старадарожскае і слуцкае ткацтва (Цэнтральная Беларусь) развівалася пад уплывам пэўных фактараў, якія вызначылі фарміраванне іх мастацка-стылістычных асаблівасцей. У гэтым рэгіёне здаўна адбываўся актыўны працэс узаемадзеяння народнага ўзорнага ткацтва з іншымі формамі рамяства – мануфактурамі і рамесніцкімі ткацкімі майстэрнямі. Таму тканіны характарызуюцца высокай якасцю гатунку і разнастайнасцю ткацкіх тэхнік. Пад уплывам мануфактурнага ткацтва шырока распаўсюдзілася пераборная тэхніка, якая значна ўзбагаціла вобразна-выяўленчыя магчымасці тканін. У зааморфных арнаментах нярэдкімі былі выявы ільвоў, птушак; геаметрычныя і раслінныя арнаменты таксама сталі больш разнастайнымі.

Дэкаратыўнасць і паліхромія як асноўныя рысы ганчарства і ткацтва гэтага перыяду асабліва праявіліся ў прыгожай, святочнай кераміцы Ракава і Івянца і ў яркіх, маляўнічых лунінецкіх і хойніцка-брагінскіх тканых вырабах (Усходняе Палессе). Ракаўскія і івянецкія вырабы вельмі дэкаратыўныя. Кераміка ў Ракаве распісвалася яркімі расліннымі і кветкавымі матывамі, у Івянцы ўпрыгожвалася фляндроўкай. Паліва ў вырабах наносілася як унутры, так і звонку. Увогуле вырабы гэтых цэнтраў адрозніваюцца прапрацаванай дасканаласцю формаў і дэкаратыўным знешнім выглядам. Такія ж яркія, святочныя, маляўнічыя лунінецкія і хойніцка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

брагінскія тканіны і ручнікі. Арнаментальныя бардзюры робяцца больш шырокімі, узоры буйнейшымі (Лунінец), з'яўляюцца 8–16-пялёсткавыя разеткі, узоры арнаментальных шырокіх палос у ручніках вылучаюцца разнастайнасцю і ні ў адным з бардзюраў не паўтараюць адзін аднаго.

Сустракаюцца цэнтры, дзе майстры ткацтва і ганчарства выкарыстоўвалі старажытныя тэхналогіі і сціплы дэкор. Напрыклад, ганчарныя цэнтры ў Ганевічах, Сіняўцы, Заблоцці захавалі старажытную тэхналогію, і там рабілі посуд самых простых формаў; або тканыя вырабы Панямоння, дзе традыцыі ткацтва на працягу стагоддзяў развіваліся пад уплывам заходнееўрапейскага рамяства, якія адрозніваюцца стрыманасцю і нияркасцю і пры гэтым вылучаюцца багаццем дробнай узорыстай фактуры. В.А.Лабачэўская прыводзіць прыклады аб запазычванні рамеснікамі панёманскіх гарадоў малюнкаў арнаментаў з еўрапейскіх друкаваных выданняў, а таксама аб уплыве вырабаў Беластоцкага прамыслова-тэкстыльнага раёна.

Увогуле развіццё традыцый ткацтва і ганчарства ў першай палове XX ст. адбывалася даволі неаднародна і неадназначна. Народнае мастацтва працягвала задавальняць патрэбы насельніцтва і разам з тым мяняла свой характар.

1. *Елатомцева И.* Художественная керамика Советской Белоруссии. – Мн., 1966.

2. *Кацар М.С.* Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка. – Мн., 1966.

3. *Кацер М.С.* Народно-прикладное искусство Беларуси. – Мн., 1972.

4. *Курилович А. Н.* Белорусское народное ткачество. – Мн., 1981.

5. *Лабачэўская В.А.* Повязь часоў – беларускі ручнік. – Мн., 2002.

6. *Сахута Я.М.* Народнае мастацтва Беларусі. – Мн., 1997.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ